Весці БДПУ. Серыя 2. 2020. № 4. С. 90–94

УДК 070:796(476)(091)

# СПАРТЫЎНАЯ ПРЭСА Ў БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ (НА МЯЖЫ XIX–XX стст.)

**С. І. Бусько,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры філасофіі і гісторыі БДУФК*

Паступіў у рэдакцыю 13.11.20.

UDC 070:796(476)(091)»

# SPORTING PRESS IN BELARUSIAN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE (AT THE TURN OF THE 19–20th CENTURIES)

**S. Busko,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of Philosophy and History, BSUPC*

Received on 13.11.20.

Артыкул прысвечаны маларaспрацаваным аспектам гісторыі фізічнай культуры і спорту Беларусі. Асноўная ўвага нададзена праблеме ўзнікнення спартыўнай прэсы ў беларускіх губернях у канцы XIX – пачатку XX ст. Аўтар разглядае фарміраванне гэтага кірунку журналістыкі на тэрыторыі Расійскай імперыі, асноўныя тыпы спартыўных выданняў, іх эвалюцыю ў пачатку XX ст. Разгледжана з'яўленне як тэматычных раздзелаў у традыцыйных выданнях, так і спецыялізаваных выданняў, вызначана іх аўдыторыя і памеры тыражу, асобна адзначаны выяўленыя карэспандэнты з беларускіх губерняў. Зроблена спроба прасачыць памеры паступленняў профільных выданняў у беларускія губерніі. Падкрэслена, што адсутнасць спецыялізаванай спартыўнай прэсы ў беларускіх губернях сведчыць аб запаволенасці працэсаў фарміравання грамадства новага тыпу і недастатковым развіцці гарадской культуры баўлення вольнага часу. Адзначаецца адставанне ад суседніх рэгіёнаў (Кіеў, Рыга, Варшава, Смаленск) у цікавасці да фізічнай культуры і спорту ў штодзённым жыцці.

*Ключавыя словы:* спартыўны часопіс, дарэвалюцыйны перыядычны друк, развіццё спорту, фізічная культура, спартыўная журналістыка.

The article is devoted to the little studied aspects of history of physical culture and sports of Belarus. The main attention is paid to the problem of appearance of sporting press in Belarusian provinces in the end of the 19th – the beginning of the 20th century. The author considers forming of this direction of journalism in the territory of the Russian Empire, the main types of sporting editions, their evolution in the beginning of the 20th century. The article considers appearance of thematic units in traditional editions as well as specialized editions, defines their audience and the circulation. Separately the revealed correspondents from the Belarusian provinces are marked. An attempt was made to trace the scale of arrival of the profile editions to the Belarusian provinces. The paper highlights that the absence of specialized sporting press in the Belarusian provinces proves the slow speed of the processes of forming the society of a new type and insufficient development of city culture  of spending leisure time. It marks the lag from the neighboring regions (Kiev, Riga, Warsaw, Smolensk) in interest to physical culture and sports in everyday life.

*Keywords*: sportng magazine, prerevolutionary periodical press, development of sports, physical culture, sporting journalism.

*Уводзіны.* Навыкі і веды, якія атрымліваюць пры актыўнай фізічнай дзейнасці, напрамую ўплываюць на дабрабыт насельніцтва, паляпшаюць фізічны і псіхалагічны стан чалавека. Фізічная культура і спорт набываюць усё большае значэнне ў сучасным грамадстве. Перыядычны друк адлюстроўвае цікавасць грамадства да пэўных інавацый ці праблем. Узнікненне новых кірункаў журналістыкі (у разглядаемым выпадку спартыўнай), рост колькасці артыкулаў і часопісаў такога профілю, дынаміку колькасці іх нумароў можна разглядаць як адзін з індыкатараў, якія дэманструюць пашырэнне ў беларускім грамадстве новых сацыяльных з'яў на мяжы XIX–XX стст.

Спартыўная журналістыка – гэта від грамадскай дзейнасці па зборы, апрацоўцы і перыядычным распаўсюджванню актуальнай інфармацыі аб фізічнай культуры і спартыўных падзеях у сваёй краіне і за мяжой. Атрыманыя даныя дазваляюць ацаніць тэмпы сацыяльных змен, асабліва пры параўнанні з суседнімі рэгіёнамі.

*Асноўная частка.* Сістэма спартыўнай прэсы фарміравалася на двух спалучаных узроўнях: першы ўзровень складалі спартыўныя аддзелы агульнай прэсы; другі – спецыялізаваныя спартыўныя друкаваныя выданні.

Агульная прэса – менавіта такая назва замацавалася ў другой палове XIX ст. за выданнямі з універсальнай тэматыкай. Спорт невыпадкова ўзнікае ў першую чаргу на старонках менавіта дадзенага тыпу перыёдыкі – для з'яўлення такога аддзела ў штодзённых газе-

тах спартыўнае жыццё, яшчэ беднае на падзеі, не давала дастаткова падстаў. Затое ў якасці новага, яркага феномена спорт прыцягваў увагу грамадства, гэта не магло не зацікавіць штотыднёвікі, асабліва ілюстраваныя. Сама іх канцэпцыя была разлічана на збор звестак з розных сфер і галін жыцця, каб прапанаваць займальнае і разнастайнае чытанне сваёй шматлікай аўдыторыі (якая ахоплівала ўсе ўзросты і саслоўі) [2, с. 181].

Аднак для спартыўных раздзелаў агульнай прэсы была характэрна несістэмнасць, сцісласць, невыразнасць. Гэта было выклікана адсутнасцю неабходных спецыялістаў у спартыўнай галіне. На першым этапе, калі на старонках журналаў узнікалі невялікія інфармацыйныя спасылкі на падзеі з іпадрома, стадыёна ці палявання, майстроў слова не існавала; пасля пашырэння сферы фізічнай культуры і спорту такія майстры пераважна абіралі супрацоўніцтва са спецыялізаванымі выданнямі: тут і ўзровень дыскусіі, і аўдыторыя былі значна цікавейшымі. Выданні агульнай прэсы да пачатку 1900-х гг. не мелі спецыяльных супрацоўнікаў у гэтай сферы (аб чым сведчаць, напрыклад, штатныя расклады розных выданняў: ад «Нівы» да «Губернскіх ведамасцей»).

Аднак нават пры такіх аматарскіх падыходах ігнараваць гэты сегмент нельга: прадстаўнікоў такіх газет і часопісаў цікавіла ўсё незвычайнае ў горадзе і наваколлі. Гэта былі як самыя важныя моманты ў гісторыі спорту, так і несур’ёзныя дробязі. Так, на старонках «Мінскага лістка» у 1891 г. знайшлося месца і для апісання палёту Драўніцкага на паветраным шары над Губернатарскім садам г. Мінска, і для апісання гарадскіх каткоў. У сваю чаргу газета «Мінскі голас» (1911 г.) на сваіх старонках дадае велатрэк да ліку забаўляльных устаноў, згадваючы яго ў адным шэрагу з тэатрам, цыркам, кінатэатрамі, рэстаранамі. Майскі нумар «Мінскага слова» за 1912 г. параўноўваў узровень развіцця выкладання сакольскай гімнастыкі: «Наадварот, у Бабруйскай гімназіі сакаліная гімнастыка пастаўлена непараўнальна лепш, чым у г. Скаканека ў Мінску. Там выдатна кідаюць дыск і кап’ё» [5, с. 52]. Эліта беларускіх губерняў выпісвала для сябе агульную прэсу з Масквы і Санкт-Пецярбурга, што дазваляла азнаёміцца з самымі актульнымі падзеямі [11]. Напрыклад, папулярнае ў віленскага і віцебскага губернатараў «Русское обозрение» нават змясціла на сваіх старонках справаздачу аб Алімпійскіх гульнях 1896 г.

Матэрыялы журналістаў у такіх выданнях можна ўмоўна падзяліць на некалькі блокаў: паведамленні без загалоўкаў у складзе шматлікіх інфармацыйных рубрык (інфармацыя аб палётах С. Утачкіна на Камароўскім полі); паўнавартасныя публікацыі (гісторыя лаўнтэніса ў Брытаніі); аб’явы (праезд удзельнікаў аўтапрабегу праз умоўны Гомель ці Магілёў); шахматныя загадкі.

Матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Мінску даюць магчымасць прасачыць не толькі надрукаваны матэрыял «Віцебскіх губернскіх ведамасцей», але і той, што не трапіў у друк (але паступіў у рэдакцыю). Інфармацыя аб фізічнай культуры і спорце друкавалася ў неафіцыйным аддзеле, сістэмнасці і рэгулярнасці ў публікацыях не прасочваецца; але можна адзначыць, што з’яўленне разглядаемай тэматыкі стала вынікам новай рэдакцыйнай палітыкі пасля прызначэння рэдактарам І. Піліна. Так, за красавік 1895 г. змешчана інфармацыя аб спаборніцтвах на роварах у Варшаве; за студзень-сакавік 1898 г. – вынікі мясцовых спартоўцаў-канькабежцаў і раварыстаў-аматараў; выданні за сакавік-красавік 1900 г. утрымліваюць звесткі аб лекцыі для аматараў веласпорту, аб графіку працы мясцовага яхт-клуба, увядзенні новага курсу гімнастыкі ў кадэцкіх карпусах [9, арк. 1160, 1173]. У пачатку XX ст. на старонках аддзела ўзнікаюць новыя тыпы артыкулаў: гісторыя ровара ў Віцебску, абмеркаванне ўласнай вытворчасці спартыўнага абсталявання, міфы і легенды з гісторыі агульнарасійскага спорту [10, арк. 166, 170]. Усю першую палову чэрвеня 1910 г. друкавалі матэрыялы (вытрымкі з часопіса «Аўтамабіліст»), прысвечаныя аўтамабільным спаборніцтвам па маршруце Санкт-Пецярбург – Віцебск – Кіеў – Масква – Санкт-Пецярбург [1, с. 3].

Цікавы момант звязаны з красавіцкімі нататкамі, прысвечанымі трагедыі 5 красавіка 1902 г. на шатландскім футбольным стадыёне «Айбракс Парк» – 25 аматараў загінулі на трыбуне падчас гульні і каля 500 былі паранена. Ужо праз некалькі дзён гэтыя падзеі разглядаліся ў «Віцебскіх губернскіх ведамасцях» [10, арк. 17]. Трэба адзначыць, што афіцыйнай датай першай гульні ў футбол на тэрыторыі сучаснай Беларусі лічыцца 1911 год. Таму аўтар нататка асобна тлумачыць чытачам і назву гульні, ужываючы і foot ball, і нажны мяч.

Такая сітуацыя са спартыўнымі публікацыямі была характэрна не толькі для Віцебскіх губернскіх ведамасцей, але і для астатніх губерній. Прыватныя выданні з ліку агульнай прэсы ўзгадвалі спорт па-рознаму. «Гомельская капейка» з пачатку выхаду газеты амаль у кожным нумары 1911–1913 гг. на апошняй старонцы ў спецыяльным раздзеле «Спорт» асвятляла актуальныя мясцовыя пытанні: навіны з футбольнага жыцця, спартыўную інфраструктуру Гомеля, перспектывы пабудовы яхт-клуба і іншыя пытанні [8, с. 3]. Газета «Дзвінскі лісток» на працягу 1900–1903 гг. друкавала спартыўныя матэрыялы і рэкламу ў раздзеле «Мясцовая хроніка». Наяўнасць спартыўнай інфармацыі была характэрна для агульнай прэсы, што арыентавалася на гарадскога спажыўца.

Газеты і часопісы, што арыентаваліся на іншую, пераважна местачковую і сельскую аўдыторыю, спорт і фізічную культуру не ўзгадваюць увогуле. Вывучэнне нумароў «Нашай Нівы» за 1912 г. паказала поўную адсутнасць артыкулаў такога кшталту (нават з улікам выступлення расійскай каманды на Алімпійскіх гульнях у Стакгольме). Сур'ёзная грамадска-палітычная расійская прэса зацікавілася спортам толькі ў 1910-я гг., калі ён канчаткова перайшоў з катэгорыі незвычайнага і незразумелага спосабу баўлення вольнага часу і стаў успрымацца як значная з'ява ў жыцці грамадства. На жаль, адпаведныя мясцовыя беларускія выданні такога ўзроўню асвятлення спартыўнай тэматыкі дасягнулі толькі ў савецкія часы. Аднак зазначым, што роля агульнай прэсы ў справе папулярызацыі спорту і фізічнай культуры не менш значная, чым у спецыялізаваных часопісаў. Дзякуючы арыентацыі на шырокую аўдыторыю, менавіта на старонках агульнай прэсы насельніцтва беларускіх губерняў Расійскай імперыі знаёмілася са спортам і наступнымі, больш спецыялізаванымі выданнямі.

Спецыялізаваныя перыядычныя выданні, прысвечаныя спорту, фізічнай культуры і баўленню вольнага часу, можна падзяліць на тры групы:

а) выданні, прысвечаныя асобнаму віду спорту ці фізічнай культуры («Самокат», «Лаун-теннис», «Яхта», «Автомобиль», «Циклист», «Спасание на водах» і іншыя);

б) афіцыйныя выданні канкрэтных спартыўных устаноў ці арганізацый («Сокол», «Вестник Московского общества велосипедистов-любителей», «Ежегодник Всероссийского союза лаун-теннисных клубов» і інш.);

в) часопісы, прысвечаныя ўсім відам спорту («Спорт», «Русский спорт», «Спортивное обозрение», «Стадион», «К спорту» і інш.) [12, с. 24].

У разглядаемы перыяд у Расійскай імперыі выдавалася некалькі сотняў часопісаў з рознай працягласцю існавання (ад года і да пятнаццаці). У сярэдзіне XIX ст. ідэі спорту ў Расійскай імперыі пашыраліся праз арганізацыю розных грамадскіх арганізацый, спартыўных гурткоў. Працэс пайшоў не толькі ў Маскве і Санкт-Пецярбургу, але і ў правінцыі – Кіеве, Рызе, Адэсе, Саратаве. Да сярэдзіны 1880-х гг. адначасова існавала толькі 4–5 часопісаў, якія забяспечвалі ўвесь попыт [6, с. 130]. За наступныя два дзесяцігоддзі адбываецца паступовы колькасны рост, які пасля невялікага спаду ў 1905–1907 гг., дасягне свайго піка напярэдадні Першай сусветнай вайны.

Сярод выданняў, прысвечаных асобнаму віду спорту, значную папулярнасць у беларускіх губернях у канцы XIX ст. набылі часопісы «Цыкліст» і «Самакат». Гэта тлумачылася цікавасцю да ровара і звязаных з ім пытанняў здаровага ладу жыцця, кірункаў ваеннага выкарыстання, праблем мясцовай інфраструктуры. У 1894–1904 гг. гэтыя часопісы замаўляліся ў Віцебску, Менску, Вільні, Берасці і нават у Баранавічах з Оршай. Важна падкрэсліць, што беларускія чытачы не толькі пасіўна знаёміліся з інфармацыяй, але і самі актыўна друкаваліся ў гэтых выданнях, удзельнічалі ў палеміцы на старонках расійскай прэсы, дасылалі даныя аб спартыўных падзеях у сваіх гарадах.

Віцебскі карэспандэнт часопіса «Самакат» К. Шэлепін дасылае ў рэдакцыю свае меркаванні аб стане дарог губерніі ў 1894 г. і планы на спартыўны сезон 1895 г.: «…Витебск располагает тремя шоссейными дорогами, которые являются весьма удобным местом для самокатной езды. Очень часто можно встретить на них целые группы велосипедистов, отправляющихся на ближайшие станции, чтобы весело провести несколько свободных часов в веселой болтовне за чаем. Многие совершали поездки в ближайшие города, как, например Городок, Невель, Орша, Могилев. В предстоящем сезоне несколько человек наших туристов собираются ехать в Киев, но не знаю, исполнят ли они это в действительности или нет» [13, с. 152]. Яго нататкі раз у два-тры месяцы з'яўляліся на старонках часопіса.

Не абміналі сваёй увагай мясцовыя аўтары і праблемы ўдзелу жанчын у спартыўным жыцці беларускіх губерняў: «К числу наиболее интересных новостей следует, прежде всего, отнести распространение в нашем городе Витебске дамской езды на велосипеде. Мы с особенным удовольствием отмечаем такое отрадное явление, вполне рассчитывая видеть у себя в предстоящем сезоне еще большее число велосипедисток» [13, с. 153].

Значная частка артыкулаў з крытыкай мясцовых дарог і інфраструктуры, якія прысвечаны беларускім губерням, падпісана псеўданімамі. Жыхар Брэст-Літоўска пад псеўданімам «Дядя Том» адзначае ў сваім лісце ў рэдакцыю ў 1895 г.: «В городе с 50-тысячным населением имеется только одна порядочная "механическая" мастерская, принадлежащая немцу» [4, с. 142]. Аўтар пад ініцыяламі Б-н распавядае аб стане дарог у павеце, друкуе маршруты вандровак вакол Брэста, дае парады для лепшага адпачынку [3, с. 135]. Выданне «Спасание на водах» у 1911 г. на сваіх старонках дае справаздачы аб развіцці сваіх філіялаў па кожнай губерніі, у тым ліку па Віленскай і Магілёўскай.

Афіцыйныя выданні канкрэтных спартыўных устаноў ці арганізацый у беларускіх губернях нешматлікія. Гэта выклікана больш запаволеным фарміраваннем спартыўных арганізацый у параўнанні з украінскімі ці прыбалтыйскім гарадамі, невялікай колькасцю ўдзельнікаў і абмежаваным бюджэтам. Цікавасці да агуль-

нарасійскіх выданняў пры аналізе іх бібліятэк не выяўлена. Самая значная колькасць артыкулаў, прысвечаных беларускім губерням, адзначаецца на старонках афіцыйных друкаваных органаў сакольскага руху. Напрыклад, сакольскаму гімнастычнаму выступленню навучэнцаў Магілёўскіх сярэдніх навучальных устаноў быў прысвечаны вялікі артыкул у № 3 часопіса «Сокал» у 1911 г., паспяховы ўдзел выкладчыкаў віленскіх і магілёўскіх навучальных устаноў на Усесакольскім злёце ў Празе трапіў на старонкі № 1 за 1912 г. [14, с. 55].

Спартыўная прэса, прысвечаная ўсім відам спорту, была незапатрабаваная. Спіс выданняў на 1908, 1912 гг., якія былі выпісаны па Мінскай, Магілёўскай губерніі, дазваляе казаць аб невысокім попыце на выданні такога кшталту. Каштавалі такія выданні нятанна, што яшчэ больш змяншала аўдыторыю. На жаль, на тэрыторыі Беларусі ў пачатку XX ст. не адбывалася і значных спартыўных мерапрыемстваў, як вынік і цікавасць цэнтральнай прэсы да гэтага рэгіёну была невысокая. Асноўная частка ўзгадак аб нашых гарадах была звязана з велаі аўтапрабегамі. Так, часопіс «Автомобилист» на працягу першай паловы 1910 г. друкаваў матэрыялы аб міжнароднай гонцы Санкт-Пецярбург – Віцебск – Гомель – Кіеў [7, с. 1].

Асобным элементам спартыўнай прэсы стала з’яўленне спартыўных фотаздымкаў як абавязковага кампанента. Ад самага пачатку фарміравання спартыўных выданняў фарміруецца попыт на ілюстрацыі. Гэта дазваляла чытачам дакрануцца да спаборніцтваў, лепш зразумець атмасферу мерапрыемства. Спартыўныя выданні і арганізацыі выкарыстоўвалі фотаздымкі для папулярызацыі свайго віду спорта. Напрыклад, групавыя партрэты спартсменаў прадстаўлялі каманду ці таварыства аматараў футбола ці кракета, таксама гэта маглі быць кадры, дзе сям’я і блізкія сябры на адпачынку ў перапынку паміж гульнёй у тэніс або кракет (падлеткі Радзівілы з тэніснымі ракеткамі ў Нясвіжы, сям’я Нядзвецкіх на корце ў Нізголава, атлеты мінскага аддзялення таварыства Sanitas і сотні іншых). Людзі на іх далёка не заўсёды апранутыя ў спартыўную вопратку, галаўныя ўборы з эмблемамі каманды таксама могуць быць усяго на двух-трох яе членах. Гэтыя фатаграфіі часцей за ўсё рабіліся з нагоды нейкай гульні паміж клубамі ці непасрэдна пры перамозе ў спаборніцтве (тады ў прасторы кадра з’яўлялася атрыбутыка пераможцы) [15, с. 201].

Пачатак ваенных дзеянняў у Першай сусветнай вайне істотна паўплываў на колькасць і тыражы спартыўных выданняў. Спецыяльная прэса хутка пачала адчуваць рост коштаў на паслугі тыпаграфіі, знікненне неабходнай паперы, запаволены абмен інфармацыяй (напрыклад, фотаздымкамі ці вынікамі спаборніцтваў), вынікі мабілізацыі і смерць часткі спартсменаў і журналістаў. Сфера спартыўнай прэсы была не вельмі маштабнай, у шматлікіх выпадках у адной асобе спалучаліся функцыі і спартсменаў, і журналіста, і выдаўца – і прызыў у армію па сутнасці прыводзіў да знікнення часопіса ці газеты.

Сучасны спорт і сучасная прэса паўсталі і раслі разам. Газеты і часопісы спрыялі папулярызацыі спорту. Яны апісвалі спартыўныя падзеі, давалі рэкламу, публікавалі вынікі спаборніцтваў, стваралі герояў і стандарты прыгажосці. Яны праводзілі спаборніцтвы на свае прызы, абмяркоўвалі і стваралі правілы кожнай гульні. Фармавалі аблічча жыхара новага горада і стыль паводзінаў, якіх павінны былі прытрымлівацца ўсе слаі грамадства. Гісторыя спартыўнай прэсы і гісторыя спорту цесна перапляліся, стварыўшы два культурныя феномены.

*Заключэнне.* Агульнарасійская спартыўная прэса з’яўляецца ў беларускіх губернях у другой палове XIX ст, але да пачатку Першай сусветнай вайны цікавасць да яе не набывае значных памераў. У адрозненне ад Рыгі, Кіева, Варшавы ў беларускіх гарадах не ўзнікла ўласнага друкаванага выдання прысвечанага спорту. Большасць матэрыялаў была змешчана на старонках агульнай прэсы, што сведчыла аб невысокай зацікаўленнасці насельніцтва. Попыт на спецыялізаваныя выданні і супрацоўніцтва з імі прасочваецца на мяжы XIX–XX стст., але толькі па самых «дэмакратычных» кірунках – ровар, атлетыка, гімнастыка; набывае папулярнасць спартыўны фотаздымак. Відавочна, што працэсы мадэрнізацыі не паспелі глыбока закрануць грамадства ў дадзенай сферы. Фарміраванне паўнавартаснай беларускай спартыўнай прэсы адбудзецца толькі пасля Першай сусветнай вайны.


Літаратура

1. Автомобильное испытание // Витебские губернские ведомости. – 1910. – 18 июня. – № 134. – С. 3.
2. *Алексеев, К. А.* Развитие отделов спорта в изданиях общей тематики в XIX веке / К. А. Алексеев // Вестник Санкт-Петербургского университета. – 2014. – Сер. 9. – Вып. 2. – С. 180–188.

References

1. Avtomobil’noe ispytanie // Vitebskie gubernskie vedomosti. – 1910. – 18 iyunya. – № 134. – S. 3.
2. *Alekseev, K. A.* Razvitie otdelov sporta v izdaniyah obshchej tematiki v XIX veke / K. A. Alekseev // Vestnik Sankt-Peterburgskogo universiteta. – 2014. – Ser. 9. – Vyp. 2. – S. 180–188.

3. Б-н, Т. Корреспонденции из Бреста / Т. Б-н // Самокат. – 1894. – № 32. – С. 134–135.
4. Дядя Том. Корреспонденции из Брест-Литовска / Дядя Том // Самокат. – 1894. – № 51. – С. 142.
5. *Крапивин, С*. Железо нужнее золота. Военрук и физрук в дореволюционной минской гимназии / С. Крапивин // Армия. – 2011. – № 5. – С. 48–53.
6. Международное состязание автомобилей Санкт-Петербург – Киев – Москва // Автомобилист. – 1910. – 10 апреля. – № 7. – С. 1.
7. *Миляев, А. С.* О речном яхт-клубе / А. С. Миляев // Гомельская копейка. – 1911. – 15 июня. – № 4. – С. 3.
8. *Лукосяк, Ю. П.* Динамика количества спортивных журналов в дореволюционной России (1860–1917 гг.) / Ю. П. Лукосяк // Ученые записки университета имени П. Ф. Лесгафта. – 2015. – № 6 (124). – С. 128–132.
9. Наряд частным корреспонденциям, письмам и статьям, напечатанных в неофициальной части губернских ведомостей / Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Фонд 1416. Оп. 6. Дело 637.
10. Наряд частным корреспонденциям, письмам и статьям, напечатанных в неофициальной части губернских ведомостей / Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Фонд 1416. – Оп. 6. – Дело 697.
11. О выписке для Минского губернатора газет и журналов на 1894 г. / Национальный исторический архив Беларуси (НИАБ). – Фонд 295. – Оп. 1. – Дело 6814.
12. *Хмельницкая, И. Б*. Спортивные общества и досуг в столичном городе начала XX века. Петербург и Москва / И. Б. Хмельницкая. – М. : Новый хронограф, 2011. – 336 с.
13. *Шелепин, К.* Корреспонденции. Витебск / К. Шелепин // Самокат. – 1894. – № 10. – С. 152–154.
14. Школьные известия. Могилев // Сокол. – 1911. – № 3. – С. 55–57.
15. *Юргенева, А. Л.* Спортивная фотография XIX века: социум и концепт движения / А. Л. Юргенева // Проблемы медиакультуры. – 2019. – № 3. – С. 170–224.

3. B-n, T. Korrespondencii iz Bresta / T. B-n // Samokat. – 1894. – № 32. – S. 134–135.
4. Dyadya Tom. Korrespondencii iz Brest-Litovska / Dyadya Tom // Samokat. – 1894. – № 51. – S. 142.
5. *Krapivin, S.* Zhelezo nuzhnee zolota. Voenruk i fizruk v dorevolyucionnoj minskoj gimnazii / S. Krapivin // Armiya. – 2011. – № 5. – S. 48–53.
6. Mezhdunarodnoe sostyazanie avtomobilej Sankt-Peterburg – Kiev – Moskva // Avtomobilist. – 1910. – 10 aprelya. – № 7. – S. 1.
7. *Milyaev, A. S.* O rechnom yaht-klube / A. S. Milyaev // Gomel'skaya kopejka. – 1911. – 15 iyunya. – № 4. – S. 3.
8. *Lukosyak, Yu. P.* Dinamika kolichestva sportivnyh zhurnalov v dorevolyucionnoj Rossii (1860–1917 gg.) / Yu. P. Lukosyak // Uchenye zapiski universiteta imeni P. F. Lesgafta. – 2015. – № 6 (124). – S. 128–132.
9. Naryad chastnym korrespondenciyam, pis'mam i stat'yam, napechatannyh v neoficial'noj chasti gubernskih vedomostej / Nacional'nyj istoricheskij arhiv Belarusi (NIAB). – Fond 1416. Op. 6. Delo 637.
10. Naryad chastnym korrespondenciyam, pis'mam i stat'yam, napechatannyh v neoficial'noj chasti gubernskih vedomostej / Nacional'nyj istoricheskij arhiv Belarusi (NIAB). – Fond 1416. – Op. 6. – Delo 697.
11. O vypiske dlya Minskogo gubernatora gazet i zhurnalov na 1894 g. / Nacional'nyj istoricheskij arhiv Belarusi (NIAB). – Fond 295. – Op. 1. – Delo 6814.
12. *Hmel'nickaya, I. B.* Sportivnye obshchestva i dosug v stolichnom gorode nachala HH veka. Peterburg i Moskva / I. B. Hmel'nickaya. – M. : Novyj hronograf, 2011. – 336 s.
13. *Shelepin, K.* Korrespondencii. Vitebsk / K. Shelepin // Samokat. – 1894. – № 10. – S. 152–154.
14. Shkol'nye izvestiya. Mogilev // Sokol. – 1911. – № 3. – S. 55–57.
15. *Yurgeneva, A. L.* Sportivnaya fotografiya XIX veka: socium i koncept dvizheniya / A. L. Yurgeneva // Problemy media-kul'tury. – 2019. – № 3. – S. 170–224.